ЦЭНТР
ЕЎРАПЕЙСКАЙ
ТРАНСФАРМАЦЫІ




# Беларуская сфера культуры ў 2020-2023 гадах: страты і здабыткі

Аналітычны агляд

© **Цэнтр еўрапейскай трансфармацыі**, 2023

# Змест

Уводзіны ... 3
1. 2020-2023 гады: страты і здабыткі беларускай сферы культуры ... 5
2. Змены ў дзяржаўнай палітыцы ў галіне культуры ... 8
3. Адаптацыя актараў незалежнай сферы культуры да зmененай сітуацыі ... 10
4. Асноўныя выклікі развіцця беларускай сферы культуры і стратэгіі іх пераадолення ... 12
Асноўныя вынікі аналізу і агульныя высновы ... 15

# Уводзіны

Дадзены аналітычны агляд падрыхтаваны ў жніўні 2023 года на падставе рэгулярных даследаванняў сферы культуры, якія Цэнтр еўрапейскай трансфармацыі (ЦЕТ) праводзіць цягам апошніх васьмі гадоў. У 2015 годзе намі была распрацаваная метадалогія ацэнкі рэалізацыі ў Беларусі каштоўнасцяў і нормаў Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове і заахвочанні разнастайнасці формаў культурнага самавыяўлення ды праведзенае першапачатковае даследаванне[1]. Наступныя этапы маніторынгу былі зладжаныя ў 2019-м[2] і 2022-м[3] гадах, яны дазволілі супаставіць вынікі і прасачыць дынаміку развіцця ўнутры беларускага культурнага поля. Высновы апошняга маніторынгавага замеру і іншыя даследаванні беларускай сферы культуры, праведзеныя ЦЕТ цягам апошніх трох гадоў, леглі ў аснову дадзенага агляду.

У 2020-2023 гадах беларуская сфера культуры аказалася пад уздзеяннем трох надзвычай моцных шокаў:

- пандэміі новай каранавіруснай інфекцыі COVID-19 і беспрэцэдэнтных мераў па барацьбе з ёю;
- вострага ўнутрыпалітычнага крызісу, што развіўся ў Беларусі пасля падзей 2020 года, і звязаных з ім беспарапынных масавых палітычных рэпрэсій супраць грамадзянскай супольнасці краіны;
- поўнамаштабнай ваеннай агрэсіі Расіі супраць Украіны, у якой афіцыйная Беларусь выступіла на баку першай.

Гэтыя падзеі ў роўнай ступені сталі ўзрушэннямі і стварылі новыя выклікі для дзеячаў культуры, паслужылі штуршкамі да пераасэнсавання зместу беларускай культуры як такой, напаўнення яе новымі сэнсамі, да актуалізацыі культурных традыцый і спадчыны. Шмат для каго сфера культуры перастала асацыявацца з вольным часам і забавамі, але стала ўсё

[1] Гл.: **Мониторинг реализации Республикой Беларусь Конвенции ЮНЕСКО об охране и поощрении разнообразия форм культурного самовыражения** (2015) // Цэнтр еўрапейскай трансфармацыі. — 08.09.2015: http://cet.eurobelarus.info/files/userfiles/5/CET/2015_Convention_UNESCO-Monitoring.pdf.

[2] Гл.: **Маніторынг рэалізацыі Рэспублікай Беларусь Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове і заахвочанні разнастайнасці форм культурнага самавыяўлення** (2019) // Цэнтр еўрапейскай трансфармацыі. — 13.08.2019: https://cet.eurobelarus.info/files/userfiles/5/CET/2019_Convention_UNESCO-Monitoring_BE.pdf.

[3] Гл.: **Мониторинг реализации Республикой Беларусь Конвенции ЮНЕСКО об охране и поощрении разнообразия форм культурного самовыражения** (2022) // Цэнтр еўрапейскай трансфармацыі. — 31.05.2023: https://cet.eurobelarus.info/ru/library/publication/2023/05/31/monitoring-realizatsii-respublikoy-belarus-konventsii-yunesko-ob-2306021901.html.

больш звязаная з грамадзянскай салідарнасцю, актуальным палітычным парадкам дня, праблемамі грамадзянскай супольнасці.

У дадзеных умовах творчая дзейнасць ператвараецца ў дзейсны інструмент і драйвер зменаў у грамадстве, што вызначае асаблівую даследчыцкую зацікаўленасць сферай культуры ў кантэксце грамадска-палітычных трансфармацый.

У падмурак структуры гэтага агляду пакладзеныя чатыры пытанні:

1) Што страціла і што здабыла беларуская сфера культуры ў 2020-2023 гадах?

2) Як змянілася беларуская дзяржаўная палітыка ў галіне культуры?

3) Як адаптаваліся/перабудаваліся беларускія недзяржаўныя культурніцкія актары?

4) Якія асноўныя выклікі стаяць сёння перад беларускай сферай культуры, і ці ёсць стратэгічныя прапановы/бачанне яе далейшага развіцця?

У нашым аглядзе мы паспрабуем кортка акрэсліць асноўныя вынікі і тэндэнцыі развіцця сітуацыі ў беларускай сферы культуры ў гэтых чатырох вымярэннях.

# 1. 2020-2023 гады: страты і здабыткі беларускай сферы культуры

**Творчы ўздым 2020 года.** Адным з эфектаў бурных палітычных падзей 2020 года стаў творчы ўздым, які выявіўся ў небывалым усплёску культурніцкай вытворчасці і спажывання. Рэвалюцыйная сітуацыя выявілася ў тым ліку ў бурным уздыме творчасці і разнастайнага крэатыўнага самавыяўлення, праяве новых ідэнтычнасцяў (у тым ліку лакальных: раён, вуліца, двор). Гэта не проста ўзбагаціла сімвалічную прастору новымі вобразамі і творамі, але, хай і на кароткі час, перабудавала характар культурніцкай вытворчасці і спажывання. Найперш гаворка ідзе пра беспрэцэдэнтныя магчымасці для публічнай дэманстрацыі: літаральна кожны чалавек ці супольнасць маглі публічна прад'явіць свой творчы крэатыў, і гэты крэатыў імгненна падхопліваўся і распаўсюджваўся далей у публічнай прасторы. У гарадах атрымаў распаўсюджванне новы спосаб узаемадзеяння артыстаў з аўдыторыяй — сустрэчы з лакальнымі супольнасцямі ў дварах жылых кварталаў. Паступова, з нарастаннем рэпрэсій, аб'ём такой крэатыўнай вытворчасці і спажывання знізіўся і да 2023 года практычна сышоў на нуль.

**Салідарызацыя культурных актараў у 2020 годзе, якая працягваецца ў інерцыйным рэжыме.** Пандэмія COVID-19, якая прыйшла ў Беларусь на пачатку 2020 года, праявіла шырокі патэнцыял салідарнасці і ўзаемадапамогі ў культурным асяроддзі. Цяжкасці ў сферы не перашкодзілі дзеячам культуры і арганізацыям актыўна ўдзельнічаць у дабрачынных кампаніях па зборы сродкаў для медыкаў і ўразлівых груп, а таксама ініцыятывах, скіраваных на дапамогу культурным установам і праектам, якія адчуваюць цяжкасці. Яшчэ ў большай меры самаарганізацыя і кааперацыя культурніцкіх актараў выявіліся ў сітуацыі палітычнага крызісу, калі голас творчых дзеячаў стаў адным з самых заўважных галасоў беларускага пратэсту. Аднак да 2023 года арыентацыя на палітычны пратэст паступова змяняецца дэпалітызацыяй беларускага незалежнага культурнага поля, назіраецца рост колькасці праектаў і ініцыятываў, не звязаных наўпрост з тэматыкай палітычных рэпрэсій, культурнага супраціву і да т.п. Гэта звязана ў тым ліку і з некаторай стомленасцю ад дадзенай тэматыкі сярод спажыўцоў культурнай прадукцыі.

**Падвышэнне статусу і ролі беларускай культуры за мяжой і ўнутры краіны.** Салідарнасць сусветнай супольнасці з беларусамі, якія выступаюць за перамены, падвысіла і цікавасць да беларускага мастацтва, асабліва (але не выключна) калі яно мае пратэсны характар. Голас дзеячаў культуры з яскрава выяўленай грамадзянскай пазіцыяй

стаў адным са значных сімвалаў грамадска-палітычнага супрацьстаяння, што паспрыяла падвышэнню цікавасці да беларускай культуры і яе прадстаўнікоў і сярод саміх беларусаў.

**Дэлегалізацыя незалежнай сферы культуры ўнутры Беларусі.** Вяртанне крымінальнай адказнасці за ажыццяўленне арганізацыямі дзейнасці без дзяржаўнай рэгістрацыі і — адначасова — амаль поўнае знішчэнне беларускага «трэцяга сектара» фактычна крыміналізіравала дзейнасць у незалежным культурным полі. Згодна з дадзенымі праваабаронцаў, пачынаючы з паслявыбарчага перыяду 2020 года і на момант канца жніўня 2023 года, у Беларусі прымусова ліквідавана (альбо знаходзіцца ў працэсе ліквідацыі) не менш за 900 некамерцыйных арганізацый розных формаў, яшчэ ў каля 500 арганізацыях прынятыя рашэнні аб самаліквідацыі[4]. У іх ліку — мінімум 220 некамерцыйных арганізацый, якія працавалі ў сферы культуры або мелі ярка выяўленую культурную скіраванасць. Гэта арганізацыі рознага парадку: ад найстарэйшых грамадскіх аб'яднанняў і саюзаў (такіх, напрыклад, як Саюз беларускіх пісьменнікаў), буйных арганізацый, якія актыўна ўдзельнічалі ў грамадска-палітычных працэсах у 2020 годзе (Беларускі ПЭН-цэнтр, «АРТ Карпарэйшн»), да мясцовых фондаў, творчых клубаў, якія займаліся захаваннем і прасоўваннем культуры нацыянальных меншасцяў, і г.д. Рэпрэсіі закранулі не толькі арганізацыі, але і дзеячаў культуры індывідуальна. Паводле дадзеных маніторынгу парушэнняў правоў у сферы культуры, які праводзіцца Беларускім ПЭН-цэнтрам, толькі ў перыяд са жніўня 2020 года па сакавік 2023 года палітычна матываваны пераслед зведалі не менш за 1875 прадстаўнікоў сферы культуры. Гэтыя пераследы маюць розную форму: ад перашкодаў ажыццяўляць творчую дзейнасць, звальненняў з працы, адміністрацыйных арыштаў і буйных штрафаў да крымінальнага пераследу і пазбаўлення волі на шмат гадоў. Па стане на сакавік 2023 года колькасць дзеячаў культуры, прызнаных палітвязнямі, складала 137 чалавек[5].

Маштабныя палітычныя рэпрэсіі, а таксама розныя перашкоды з боку дзяржавы не пакідаюць магчымасцяў для легальнай і публічнай дзейнасці вялікай колькасці прадстаўнікоў незалежнай сферы культуры, якія ў гэтых умовах вымушаныя жыць і тварыць «ніжэй за радары».

**Адток кадраў, беспрацоўе, эміграцыя ў прафесійным культурным асяроддзі** сталі натуральным вынікам палітычных рэпрэсій і ідэалагічных чыстак ва ўсіх сферах

[4] Гл.: **Ситуация со свободой ассоциаций и организациями гражданского общества Республики Беларусь: обзор за август 2023 года** // Lawtrend: https://www.lawtrend.org/freedom-of-association/situatsiya-so-svobodoj-assotsiatsij-i-organizatsiyami-grazhdanskogo-obshhestva-respubliki-belarus-obzor-za-avgust-2023-g.

[5] Гл.: **Маніторынг парушэнняў культурных правоў і правоў чалавека ў дачыненні да дзеячаў культуры. Беларусь, студзень-сакавік 2023 года** // Беларускі ПЭН. — 28.04.2023: https://penbelarus.org/2023/04/28/bel-manitoryng-parushennyau-kulturnyh-pravou-i-pravou-chalaveka-u-dachynenni-da-dzeyachau-kultury-belarus-belarus-studzen-sakavik-2023-goda.html.

прафесійнай дзейнасці. Беларуская сфера культуры з'яўляецца адной з самых пацярпелых у гэтых адносінах. Гаворка ідзе пра разнастайныя праявы «забароны на прафесію»: звальненне з працы, забарона на правядзенне мерапрыемстваў (выставаў, канцэртаў, спектакляў і да т.п.), ліквідацыя культурніцкіх інстытуцый, пазбаўленне ліцэнзій, інспекцыйныя праверкі, што паралізуюць дзейнасць арганізацый (падатковыя, па выкананні нормаў пажарнай бяспекі і да т.п.), адлічэнне студэнтаў з навучальных устаноў, «чорныя спісы» творчых дзеячаў, грашовыя штрафы і нават тэрміны ў зняволенні. Усё гэта спрыяе выштурхванню прафесіяналаў з культурніцкага поля, ставіць іх ва ўмовы немагчымасці працягваць дзейнасць у краіне і, як вынік, прымушае шмат каго з іх шукаць магчымасці для самарэалізацыі за мяжой.

**Усталяванне беларускай культуры ў статусе трансгранічнай.** З прычыны масавага «зыходу» за межы краіны дзеячаў культуры і незалежных культурніцкіх арганізацый, а таксама агулам з-за пашырэння беларускіх дыяспар у розных краінах свету, вытворчасць і спажыванне беларускай культурнай прадукцыі ўсё больш «адвязваюцца» ад Беларусі як краіны. Захоўваючы дзейнасную і сімвалічную арыентацыю на геаграфічную прастору Беларусі, беларуская культура актыўна ўпісваецца ў сусветны кантэкст і ўсё больш арыентуецца не толькі на спажыванне беларусамі, але і на ўключанасць і ўдзел у ёй міжнароднай супольнасці.

**Пазначэнне і прысваенне грамадствам культурных дамінантаў, новай нацыянальнай міфалогіі і да т.п.** У працэсе рэзкай палітызацыі беларускага грамадства праз падзеі 2020 года адбыліся прыкметныя змены ў стаўленні беларусаў да многіх каштоўнасцяў і ідэй, якія раней падтрымліваліся параўнальна невялікімі групамі, пачалося іх пераасэнсаванне і прысваенне. Гаворка ідзе пра каштоўнасці, звязаныя з нацыянальнай ідэнтычнасцю, гісторыяй, традыцыямі, беларускай мовай і культурай. Так, напрыклад, шырокае выкарыстанне атрымаў беларускі нацыянальны бел-чырвона-белы сцяг. Ён стаў галоўным сімвалам пратэстаў, а гэта ў немалой ступені паспрыяла і абуджэнню шырокай цікавасці да беларускай гісторыі і культуры сярод прыхільнікаў пераменаў. Змены ў беларускай сімвалічнай прасторы сфарміравалі дастаткова ўстойлівую сістэму культурных дамінантаў, якія маркіруюць культурнае поле вокал сябе (белы колер як сімвал негвалтоўнага характару пратэстаў, ужо згаданы нацыянальны бел-чырвона-белы сцяг, беларуская мова ды інш.) і задаюць у тым ліку ўяўленні беларусаў пра саміх сабе (новы нацыянальны міф).

# 2. Змены ў дзяржаўнай палітыцы ў галіне культуры

**Узмацненне кантролю і цэнзуры, ідэалагізацыя культуры.** З пачаткам масавых рэпрэсій супраць усёй беларускай грамадзянскай супольнасці мелі і працягваюць мець месца шматлікія выпадкі звальненняў з працы, ціску праз інспекцыйныя праверкі на культурніцкія арганізацыі (у тым ліку іх юрыдычная ліквідацыя), а таксама вялікая колькасць выпадкаў адміністрацыйнага і крымінальнага пераследу. Толькі гэтымі прыкладамі ціску рэпрэсіі не абмяжоўваюцца. У той жа час афіцыйная сфера культуры стала ўсё больш заўважна праяўляць свой прапагандысцкі патэнцыял, пераходзіць на абслугоўванне ідэалагічных практык існуючай улады. Варта адзначыць, што і да 2020 года беларуская афіцыйная сфера культуры выконвала функцыю рэалізацыі ідэалагічных установак дзейнага палітычнага рэжыму. Але пры гэтым у яе атрымлівалася захоўваць і адносна нейтральныя ў палітычных адносінах сэнсы, гэта адкрывала магчымасці для супрацоўніцтва з незалежным культурным полем. Услед за рэпрэсіямі ўлады пачалі маштабную працу па пераасэнсаванні і перапісванні гісторыі, фарсіраванні «патрыятычных» практык у грамадстве. Галоўным інструментам, які прыводзіць культуру ў адпаведнасць з афіцыйнай ідэалогіяй, сталі разнастайныя практыкі цэнзуравання.

**Стварэнне прававых і інстытуцыйных перашкодаў для незалежнай сферы культуры.** З пачатку 2021 года рэпрэсіі пачалі набываць сістэмны характар, гэта дае падставы казаць пра мэтанакіраванае знішчэнне незалежнай сферы культуры. Усе пералічаныя негатыўныя тэндэнцыі ў культуры можна назваць рэагаваннем дзейных беларускіх уладаў на паслявыбарчую крызісную сітуацыю. Але працэсі ідзе і прадстаўнікі ўлады паступовастваралюць і доўгатэрміновыя, сістэмныя, заканадаўча афармленыя абмежаванні для ўключэння ў публічнае культурнае абарачэнне незалежных актараў[6].

**Згортванне дзяржаўнай палітыкі, скіраванай на развіццё адкрытасці краіны для замежных гасцей і роўнага супрацоўніцтва з усімі дзяржавамі.** Найперш гэта закранула краіны-чальцоў Еўразвязу, асабліва суседнія з Беларуссю Польшчу, Літву і Латвію, і стала адказам беларускіх уладаў на падтрымку ўрадамі гэтых краін дзеянняў супернікаў рэжыму Лукашэнкі і ўвядзенне краінамі Захаду санкцый у дачыненні да Беларусі. Адбылася кардынальная пераарыентацыя знешняй палітыкі беларускай дзяржавы (уключаючы пытанні культурнага супрацоўніцтва) на Расію і краіны Азіі.

---

[6] Гл.: **Законодательство Республики Беларусь о культуре в контексте Конвенции ЮНЕСКО** (2022) // Лятучы ўніверсітэт: https://fly-uni.org/partnery/обзор-законодательство-республики/.

**Паўзучая русіфікацыя.** Адмова ад супрацоўніцтва ў культурнай і гуманітарных сферах з краінамі Захаду, а таксама «глыбокая інтэграцыя» з Расіяй, якая працягваецца і ўзмацняецца, непазбежна прыводзяць да росту ўплыву прарасійскага актывізму ўнутры Беларусі. Гэта датычыць шмат якіх сфер культуры на розных узроўнях: ад зменаў у афіцыйным гістарычным дыскурсе («перапісванне гісторыі», дэгераізацыя змагароў за незалежнасць Беларусі ды інш.) і выкарыстання мэсэджаў ідэалогіі «рускага міру» у актуальнай палітыцы да падаўлення і дыскрымінацыі праяваў беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці.

# 3. Адаптацыя актараў незалежнай сферы культуры да зменанай сітуацыі

**Паступовае выбудоўванне за межамі Беларусі незалежнага культурнага поля** ў формах, падобных да тых, у якіх яно існавала ў Беларусі да 2020 года (інстытуцыялізацыя праз некамерцыйныя арганізацыі і праектную дзейнасць). Розніца палягае ў тым, што, знаходзячыся ў Беларусі, незалежныя актары былі змушаныя падладжвацца пад прававыя, палітычныя і эканамічныя ўмовы аўтарытарнай дзяржавы, зараз ім даводзіцца адаптавацца да ўмоў іншых, у асноўным дэмакратычных, краін, і гэта патрабуе засваення новых норм і практык (юрыдычных, фінансавых, кіраўніцкіх). Пры гэтым сферы, якім «цяжка пераехаць» за мяжу, перажываюць даволі значную трансфармацыю. Гаворка ідзе перш за ўсё пра такія сегменты, для якіх важнай з'яўляецца сувязь з аўтэнтычным беларускім матэрыялам (напрыклад, праца з матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчынай, ахова помнікаў культуры і прыроды). Аднак і ў гэтых выпадках знаходзяцца новыя фарматы працы, якія дазваляюць у адрыве ад артэфактаў дзейнічаць і развівацца (як прыклад — платформа аўдыягідаў па беларускіх славутых мясцінах).

**Культура ў «анлайне».** Падчас актыўнай фазы пандэміі COVID-19 у Беларусі творчыя работнікі пачалі актыўна асвойваць дыстанцыйныя формы ўзаемадзеяння з аўдыторыяй, а эміграцыя (з унутрыпалітычных прычын) шматлікіх дзеячаў культуры і арганізацый зрабіла анлайн-фармат адным з галоўных спосабаў адаптацыі да новых умоваў геаграфічнага разрыву са спажыўцамі культурнага прадукту. Гэтая тэндэнцыя значна пашырыла магчымасці для ўдзелу беларусаў у вытворчасці і спажыванні культуры, аднак такія формы ўзаемадзеяння не ў поўнай меры замяняюць паўнавартасную «жывую» сувязь. Акрамя таго, анлайн-спажыванне культурнай прадукцыі даступнае хоць і большасці, але далёка не ўсім беларусам.

**Паступовая пераарыентацыя беларускіх дзеячаў культуры і арганізацый на замежнага спажыўца**, а не толькі на беларускую дыяспару і аўдыторыю ўнутры Беларусі. Адбываецца актыўнае асвойванне замежных культурных рынкаў, маркетплэйсаў і да т.п. У цэлым можна канстатаваць, што да 2023 года перыяд кансервацыі і засяроджанасці на беларускім спажыўцы (як у дыяспары, так і ўнутры краіны) скончыўся, зараз беларускія дзеячы культуры і арганізацыі шукаюць выхад на шырэйшую аўдыторыю.

**Пашырэнне практык міждысцыплінарных і міжгаліновых калабарацый.** Гаворка ідзе пра з'яўленне праектаў, у якіх не характэрным для беларускай сферы культуры чынам сумяшчаюцца розныя галіны культуры, мастацтва, новыя тэхналогіі і да т.п.

**Падвышэнне прафесійнай кваліфікацыі за кошт удзелу ў замежных адукацыйных праграмах.** Многія беларускія дзеячы культуры, апынуўшыся ў эміграцыі, пачалі актыўна карыстацца адукацыйнымі магчымасцямі, вучэбнымі праграмамі і стыпендыямі ЗША і краін-чальцоў Еўразвязу. Гэта абяцае рост узроўню прафесіяналізму ў культурніцкай супольнасці ў будучыні, а таксама адкрывае магчымасці для вырошчвання новага пакалення беларускіх арт-менеджараў, мастакоў і г.д.

**Пошук новых мадэляў фінансавання і самафінансавання.** Многія творчыя калектывы і арганізацыі, адказваючы на фінансавыя выклікі, робяць спробы выхаду за межы сістэмы донарскай дапамогі — шукаюць новыя спосабы краўдфандынгу, камерцыйныя нішы і стратэгіі развіцця (крэатыўныя індустрыі і да т.п.).

**Развіццё сеткавых і інфраструктурных элементаў у полі незалежных культурніцкіх актараў.** Гаворка ідзе пра развіццё і пашырэнне дзейнасці шэрагу даўно існых беларускіх культурніцкіх арганізацый (цяпер яны становяцца і фасілітатарамі), а таксама пра фарміраванне новых гульцоў, якія маюць патэнцыял у справе кансалідацыі разнастайных культурніцкіх актараў, распрацоўцы стратэгічнага бачання для ўсяго сектара, забеспячэння яго рэсурсамі і г.д. (Беларуская Рада культуры, ІнБелКульт 2.0). Сюды ж можна аднесці і стварэнне аб’яднанняў ды асацыяцый у асобных тэматычных сектарах культуры (*Belarusian Independent Film cademy* (*BIFA*), *Belarusian Filmmakers' Network* (*BFN*), ініцыятывы па стварэнні Беларускага тэатральнага інстытута, Інстытута беларускай кнігі і г.д.).

**Аднаўленне «апалітычнай» культурнай вытворчасці.** Калі на хвалі палітычных падзей 2020 года для беларускіх незалежных культурніцкіх актараў галоўнай тэмай стала салідарнасць і культурны пратэст, то апошнім часам пачалі ўсё больш праяўляць сябе культурніцкія праекты і ініцыятывы, якія ў сваім парадку дня не маюць адсылак да беларускай палітыкі і нацыянальнай тэматыкі ў цэлым. Такія ініцыятывы імкнуцца ствараць культурны прадукт з улікам запытаў міжнароднай аўдыторыі, пры гэтым утрымліваць сувязь з творцамі, якія знаходзяцца ў Беларусі, што вымушае дыстанцыявацца ад беларускага грамадска-палітычнага парадку дня, каб не падвяргаць іх пагрозе трапіць пад рэпрэсіі.

**Паўпадпольны, або партызанскі модус існавання незалежнай культуры ўнутры Беларусі** прагрэсіруе ў сітуацыі бесперапынных рэпрэсій і ліквідацыі вялікай колькасці грамадскіх арганізацый і ініцыятыў, якія дзейнічалі ў недзяржаўным культурным полі.

**Геаграфічнае разнясенне этапаў культурнага цыкла.** З прычыны абмежаванняў на дэманстрацыю і распаўсюджванне ўнутры Беларусі культурнай прадукцыі незалежных творцаў апошнія вымушаныя шукаць магчымасці для прэзентацыі вынікаў сваёй працы за мяжой, пры гэтым само стварэнне культурнага прадукту адбываецца ўнутры Беларусі.

# 4. Асноўныя выклікі развіцця беларускай сферы культуры і стратэгіі іх пераадолення

**Цяжкасці захавання беларускага кантэксту.** Пераарыентацыя на замежную аўдыторыю і рынкі, якая адбываецца ў шмат якіх сегментах культурнай вытворчасці, непазбежна вядзе да змяншэння вытворчасці культурнай прадукцыі з выяўленым беларускім кампанентам, на зразумелай беларусам мове і г.д.

**Фінансавыя цяжкасці.** Акрамя відавочных цяжкасцяў з фінансаваннем і адсутнасці неабходнай для шмат якіх культурных практык інфраструктурнай падтрымкі, ёсць і іншыя праблемы. Гаворка найперш пра няведанне сістэмы донарскай дапамогі, адсутнасць разумення, куды менавіта звярнуцца па фінансавую падтрымку для рэалізацыі таго ці іншага культурніцкага праекта. Акрамя таго, часта замежная донарская дапамога больш арыентавана на іншыя сферы дзейнасці беларусаў: абарона правоў чалавека, падтрымка медыяў і прадэмакратычнай палітычнай актыўнасці і г.д. Сітуацыя ўнутры Беларусі яшчэ больш складаная: пасля пагаршэння адносінаў беларускіх уладаў з заходнімі краінамі стала фактычна немагчыма атрымаць міжнародную донарскую дапамогу легальным чынам.

**Менеджмент і прасоўванне.** Адной з «класічных» праблем беларускай сферы культуры з'яўляецца недахоп кампетэнцый у прасоўванні і самарэпрэзентацыі сярод культурніцкіх дзеячаў і ініцыятыў, што запавольвае іх інтэграцыю ў міжнародны культурны зварот. Тут жа дададзім, што часта пляцоўкі і праекты, закліканыя дапамагчы культурніцкім дзеячам, прасоўваць найперш свае ўласныя прадукты (пітчынгі і да т.п.) і не даюць рэальнай магчымасці «злучэння» з патэнцыйнымі інвестарамі.

**Адсутнасць «су́вязных звёнаў» у розных галінах культурнай дзейнасці.** У той частцы беларускай незалежнай культуры, якая фарміруецца і развіваецца за межамі Беларусі, на сённяшні дзень адчуваецца недахоп дзейных лідараў культурніцкіх нішаў, якія аб'ядноўвалі б ці інфраструктурна звязвалі б (праз дзейнасць і вырашэнне пэўных праблем) тыя ці іншыя кірункі і галіны культуры. Буйныя ініцыятывы (Беларуская Рада культуры, ІнБелКульт 2.0, Прадстаўніцтва па нацыянальным адраджэнні пры Аб'яднаным пераходным кабінеце) не ў поўнай меры адказваюць на гэты запыт і ў сваім парадку дня імкнуцца ахопліваць усю незалежную культуру, часта не ўлічваючы спецыфіку асобных галінаў. Сеткавыя і інфраструктурныя аб'яднанні, якія існуюць або фарміруюцца ў асобных галінах культурнай дзейнасці (тэатр, кіно, літаратура, кнігавыданне ды інш.), пакуль знаходзяцца ў пошуку тактык і стратэгій, адэкватных сітуацыі.

**Цяжкасці ва ўладкаванні паўнавартаснай прафесійнай інфраструктуры для вытворчасці, дэманстрацыі, распаўсюджвання беларускага культурнага прадукту за межамі Беларусі.** Нягледзячы на тое, што за межамі Беларусі цягам апошніх гадоў з'явілася і развіваецца мноства створаных самімі ж беларусамі пляцовак і арт-прастораў, часта тэхнічная і кадравая іх незабяспечанасць не дазваляе разгортваць на іх паўнавартасны культурны працэс. Асабліва гэта тычыцца такіх сфер як тэатр, сучаснае мастацтва і г.д. Як правіла, іх прадстаўнікам даводзіцца звяртацца да мясцовых пляцовак, галерэй, залаў, тэатральных сцэн і г.д. і супрацоўнічаць у рамках рэалізацыі разавых выступленняў, праектаў, выстаў.

**Зніжэнне інфраструктурных магчымасцяў для развіцця дзяржаўнай сферы культуры.** Унутры Беларусі рэпрэсіі і ўзмацненне ідэалагічнага кантролю ствараюць перашкоды для развіцця не толькі незалежнага культурнага поля (мае месца практычна поўнае згортванне інфраструктурных магчымасцяў для развіцця), але і для дзяржаўнай сферы культуры і мастацтва (назіраецца кадравая незабяспечанасць, працягваюцца звальненні з працы па палітычных матывах прафесійных работнікаў). Асабліва ад уцечкі кадраў пакутуюць сферы, інстытуцыйна залежныя ад дзяржавы і яе падтрымкі, такія як рэстаўрацыя, захаванне матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны і да т.п.

**Адсутнасць «вобразу будучыні» і стратэгіі развіцця.** У змененых умовах у асяроддзі беларускай незалежнай культуры фарміруецца попыт на выпрацоўку агульнага разумення, чым з'яўляецца беларуская культура сёння, якія перспектывы і напрамкі яе развіцця, аднак механізмы выпрацоўкі агульнага стратэгічнага бачання па-ранейшаму незразумелыя.

**Адсутнасць паўнавартасных медыяплатформаў і інфармацыйнай стратэгіі па асвятленні беларускай культуры**, якая б адэкватна працавала як у сферы культуры ў эміграцыі, так і ўнутры Беларусі. Сітуацыя ўскладняецца «асіметрыяй публічнасці»: культурная дзейнасць за межамі краіны існуе ў сітуацыі нармальнай публічнасці, а ўнутры — часта ў паўпадпольным стане, што робіць яе «нябачнай» для знешняга назірання і даследавання, больш за тое, робіць яе асвятленне ў незалежных СМІ небяспечным. Апошняя акалічнасць спараджае стаўленне да культурнай сітуацыі ў Беларусі як да «выпаленай зямлі», што спрыяе назапашванню супярэчнасцяў і недастатковага разумення паміж культурніцкімі актарамі ўнутры і па-за краінай.

**Адукацыя і падрыхтоўка прафесійных кадраў у сферы культуры.** Узнікненне масавай цікавасці да беларускай культуры, а таксама параўнальная лёгкасць уваходжання ў культурніцкую дзейнасць, акрамя станоўчых эфектаў, паспрыяла таксама з'яўленню вялікай колькасці праектаў і ініцыятыў невысокага прафесійнага ўзроўню. Часткова гэта тлумачыцца абмежаванай прапановай якаснай профільнай адукацыі для беларускіх творцаў. Варта адзначыць, што за апошні час з'явілася шмат прапаноў кароткатэрміновых

курсаў, семінараў, інтэнсіваў для беларусаў, якія імкнуцца падвысіць свой прафесійны ўзровень і асвоіць новыя навыкі і кампетэнцыі ў сферы культуры, аднак такія формы па вызначэнні не з'яўляюцца паўнавартаснымі адукацыйнымі праектамі.

# Асноўныя вынікі аналізу і агульныя высновы

Такім чынам, цягам апошніх трох гадоў мы назіраем кардынальнае перафарматаванне беларускага культурнага поля: бесперапынныя палітычныя рэпрэсіі, ліквідацыя і спыненне дзейнасці грамадскіх арганізацый і ініцыятываў. Гэта прычыны масавага «зыходу» культурніцкіх дзеячаў з Беларусі, разрыву сталых сувязяў — але, разам з тым, — і перадумовы для наладжвання новых партнёрстваў, фармавання ў асяроддзі беларускай эміграцыі альтэрнатыўных цэнтраў, павышэння ўзроўню ведаў пра Беларусь і беларускую культуру за межамі краіны.

І да падзей 2020 года беларуская дзяржава імкнулася да манапольнага вызначэння агульных стратэгічных і канцэптуальных рамак культурнай палітыкі. Калі раней улады, займаючыся рэгуляваннем сферы культуры з мэтай стварэння для дзяржаўных культурніцкіх установаў лепшых умоў і канкурэнтных пераваг у параўнанні з іншымі актарамі, усё ж дапускалі суіснаванне з незалежным культурным полем, то сёння галоўнай мэтай дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры з'яўляецца поўная маргіналізацыя, выцясненне і знішчэнне любой незалежнай і непадкантрольнай актыўнасці.

Адным з доўгатэрміновых наступстваў стала перафарматаванне беларускага культурнага поля ў плане дзейнаснага статусу, магчымасцяў уплыву на культурную сітуацыю ўнутры Беларусі розных суб'ектаў (дзяржавы, грамадскага сектара, бізнесу). Самыя значныя змены ў гэтых адносінах адбыліся ў незалежным сегменце сферы культуры. Тут, з аднаго боку, раней дзейныя актары на хвалі палітычнай мабілізацыі і росту цікавасці да незалежнага культурнага кантэнту атрымалі вялікія, у параўнанні з папярэднімі гадамі, магчымасці для самапрэзентацыі і трансляцыі сваіх прадуктаў і дасягненняў. З іншага ж боку, следам за натхняльным уздымам прыйшлі жорсткія рэпрэсіі: закрыццё культурніцкіх арганізацый, эміграцыя шматлікіх дзеячаў культуры і «схлопванне» публічнай прасторы ўнутры краіны. Усё гэта прымусіла шукаць іншыя спосабы працягу сваёй дзейнасці.

Большасць акрэсленых у аглядзе праблем і выклікаў у беларускай сферы культуры выкліканая неспрыяльнай грамадска-палітычнай сітуацыяй унутры краіны, пагаршэннем палітычных, прававых, эканамічных і сацыяльных умоў для нармальнага развіцця беларускай сферы культуры. Сітуацыя эміграцыі з краіны шматлікіх культурніцкіх дзеячаў, немагчымасць публічнага існавання незалежнай культуры ўнутры Беларусі, ідэалагізацыя афіляванай з дзяржавай часткі культурнай сферы, бесперапынныя рэпрэсіі — усё гэта не проста вызначыла радыкальныя змены мадэляў існавання культурніцкіх актараў, але і падштурхнула да пастаноўкі пытання аб агульных стратэгіях развіцця беларускай сферы культуры.

***Зыходзячы з апісаных вышэй праблем і выклікаў, мы бачым магчымасць сфармуляваць тактычныя і стратэгічныя крокі для пераадолення цяжкасцяў і выхаду на станоўчы трэк развіцця беларускай сферы культуры. Праз фактычную немагчымасць уплываць на сегмент афіцыйнай культуры, дадзеныя прапановы сфармуляваныя ў першую чаргу для незалежных культурніцкіх актараў:***

- Працяг і пашырэнне практык па выхадзе на міжнародную аўдыторыю і міжнародныя рынкі, засваенне сусветнага досведу, упісванне беларускай культуры ў агульнаеўрапейскі і агульнасусветны кантэксты.

- Развіццё напрамкаў дзейнасці, відавочны недахоп якіх зараз адчуваецца ў розных галінах культуры. Гэта найперш інфраструктурныя элементы для шэрагу сфераў (хабы, сеткі дыстрыбуцыі), менеджмент культуры ды сістэмы крытыкі і рэйтынгавання.

- Захаванне сувязі з культурніцкімі актарамі ўнутры Беларусі за кошт уключэння іх у культурную вытворчасць на тых стадыях, якія дазваляюць выконваць патрабаванні бяспекі. Барацьба са стыгматызацыяй культурніцкіх актараў і дзеячаў, якія застаюцца ў Беларусі і выкарыстоўваюць у тым ліку дзяржаўную інфраструктуру, іх сімвалічная і нефармальная падтрымка.

- Пашырэнне (пераважна ў анлайне і дыстанцыйных формах) у Беларусі сеткі распаўсюджвання беларускай літаратуры, кіно, іншых беларускіх культурных прадуктаў, якія выpабляюцца па-за межамі краіны. Паколькі «дастаўка» і «дэманстрацыя» такога кшталту прадуктаў у натуральным выглядзе з'яўляецца сёння даволі рызыкоўнай і можа быць справай асобных энтузіястаў, сістэмна задачы можна вырашаць, напрыклад, за кошт выдання новых кніг у электронным фармаце і павелічэння колькасці каналаў і рэсурсаў, якія збіраюць кніжныя навінкі, кіна- і тэатральную крытыку і да т.п.

- Сістэматычныя даследаванні і маніторынг працэсаў развіцця сферы культуры і іх уплыву на беларускую і замежную аўдыторыі. Маніторынг працэсаў русіфікацыі ў Беларусі, распрацоўка новых стратэгій супрацьдзеяння ім.

- Развіццё практык папулярызацыі беларускай культурнай прадукцыі і выхаду на вялікія аўдыторыі яе спажыўцоў. Вытворчасць беларускага культурнага кантэнту з 2020 года вырасла ў разы, і гэтая акалічнасць задае перспектывы пашырэння кола носьбітаў беларускай ідэнтычнасці (беларускай мовы, нацыянальна-арыентаваных поглядаў), аднак на дадзены момант няма буйных гульцоў, якія маглі б узяць на сябе ролю прадзюсавання ўсяго гэтага культурнага масіву і забеспячэння выхаду на вялікія аўдыторыі.

- Фарміраванне «поля ўзаемных арыентацый» для суб'ектаў сферы культуры праз арганізацыю рэпрэзентацыйна-дыскусійных пляцовак для публічных абмеркаванняў і прапаноў «палітык» у галіне развіцця культуры. Такога кшталту пляцоўкі вельмі важныя для выбудоўвання гнуткіх механізмаў кіравання праз дэманстрацыю «гісторый поспеху»,

заданне ўзораў, трэндаў, складанне і публічнае прад'яўленне культурных рэйтынгаў, прэзентацыі справаздач аб дзейнасці суб'ектаў, якія прэтэндуюць на сістэмаўтваральныя пазіцыі ў сектары і да т.п. Такім чынам культурныя актары будуць мець магчымасць самастойна выбіраць найбольш зручныя для сябе мадэлі развіцця, арыентавацца на паспяховыя ці прывабныя кейсы, далучацца да тых ці іншых практык.

**Беларуская сфера культуры ў 2020-2023 гадах: страты і здабыткі**

Аналітычны агляд

© **Цэнтр еўрапейскай трансфармацыі**, 2023